ПАДЗЕЯ

# СВЯТОЧНЫЯ МАРЫ НАД НЁМАНАМ

**9 верасня дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі прыняла ўдзел у святочным бібліяфэсце «Горад мары», прымеркаваным да 895-годдзя горада Гродна.**

Бібліяфэст быў арганізаваны Дзяржаўнай установай культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна» і ДУК «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Карскага» пры тэхнічнай падтрымцы Гродзенскага цэнтра культуры. Ён стаў адным з цэлага шэрагу мерапрыемстваў пад хэштэгам «#ГРОДНО7Я!». Па ідэі арганізатараў свята, абласны цэнтр паўстае ў вобразе гарманічнай, дружнай сям'і карэнных гараджан і гасцей, прадстаўнікоў розных пакаленняў, нацыянальнасцяў і веравызнанняў, якія на працягу стагоддзяў адчуваюць сябе тут утульна і камфортна, а свае ўзаемаадносіны будуюць на аснове павагі, дружбы і разумення адзін аднаго.




Адкрытыя пляцоўкі фестывалю размясціліся на шырокай прасторы ў парку Жылібера, упадабаным месцы прыцягнення гродзенцаў. Праграма бібліяфеста «Горад мары» змясціла ў сябе ўшанаванне сямейных чытацкіх дынастый, літаратурны квэст, гульнятэкі, творчыя майстэрні, выставы кніг пра Гродна, выступленні творчых калектываў – усяго не пералічыць. Адкрытыя пляцоўкі фестывалю размясціліся на шырокай прасторы ў парку Жылібера, упадабаным месцы прыцягнення гродзенцаў. Праграма бібліяфэста «Горад мары» змясціла ў сябе ўшанаванне сямейных чытацкіх дынастый,

літаратурны квэст, гульнятэкі, творчыя майстэрні, выставы кніг пра Гродна, выступленні творчых калектываў – усяго не пералічыць. Напэўна, культуру кожнага сапраўднага, цывілізаванага горада немагчыма ўявіць без кнігі, без мастацтва слова. Абласная пісьменніцкая арганізацыя рэгулярна запрашаецца да ўдзелу ў літаратурных фестывалях абласнога і гарадскога маштабу. Нам ёсць што сказаць землякам і ў святы, і ў будні. А калі на календары шматвяковай біяграфіі горада чарговая круглая дата – тым больш. Па традыцыі для пісьменнікаў было адведзена месца для непасрэднага дыялогу з чытачом і нават для сумеснага чаявання з сябрамі ў гонар свята. Таму настрой адразу склаўся адпаведны – творчы і святочны.










GARODNA
1128












**На святочнай выставе кніг пра Гродна прадстаўлены выданні сучасных гродзенскіх аўтараў**



**У гасцях у Надзейкі-Чарадзейкі, гераіні казкі гродзенскай дзіцячай пісьменніцы Ганны Скаржынскай-Савіцкай**

Якія ж мары і надзеі звязваюць гродзенскія пісьменнікі з вобразам роднага горада-юбіляра? Вядома, нам важна, каб Гродна заставаўся горадам чытаючым, а яго жыхары цікавіліся не толькі мінулым, але і сённяшнім днём айчыннай літаратуры. Мы ўпэўненыя ў тым, што багацце гісторыі прадугледжвае і вектар, накіраваны ў будучыню. Што тычыцца ідэі патрыятызму, як паказвае рэчаіснасць, спецыфіка любові грамадзяніна да роднай літаратуры грунтуецца на ўзаемным імкненні адзін да аднаго. Так, ва ўсіх у нас на вуснах лозунг «Усё пачынаецца са свайго». Але адных лозунгаў недастаткова. У выпадку з мастацтвам слова неабходна выкананне шэрагу ўмоў. *Сваё* (культурна-інтэлектуальная, духоўная спадчына, літаратурная

творчасць, сучаснае мастацтва) павінна быць запатрабаваным – праўдзівым, свежым, арыгінальным, блізкім і цікавым чалавеку, каб у цэнтры ўвагі знаходзіўся ён сам, наш зямляк, сучасны жыхар краіны, са сваімі натуральнымі чалавечымі якасцямі, стылем жыцця, надзённымі праблемамі і трывогамі. Толькі тады, убачыўшы на старонках літаратурных твораў сябе, чалавек будзе цікавіцца мастацтвам – як адной з формаў ўласнага існавання альбо летапісам свайго напоўненага зместам жыцця.

Такім патрабаванням адпавядаюць творы, прачытаныя паэтамі на святочнай пляцоўцы бібліяфэста «Горад мары» ў падарунак гораду-юбіляру. З цёплым лірычным віншаваннем нашай любай Гародні выступіла аўтар шматлікіх прысвячэнняў гэтаму гораду, старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміла Кебіч. У аўтарскім выкананні прагучалі прысвечаныя гораду і гараджанам вершы для дзяцей, а таксама творы патрыятычнай, грамадзянскай і філасофскай лірыкі, аўтары якіх Таццяна Сучкова, Кацярына Каламійцава, Людміла Шаўчэнка, Ганна Скаржынская-Савіцкая, Дзмітрый Радзівончык, Ірына Полудзень і іншыя *(на фота ніжэй)*.







**Людміла Кебіч** **Кацярына Каламійцава**






Таццяна Сучкова




Людміла Шаўчэнка







**Ганна Скаржынская-Савіцкая** **Дзмітрый Радзівончык**







**Паэтэса-аматар Ірына Полудзень** **Паэтэса-аматар Соф’я Судзіна**








Людмила Шевч
НАВСТРЕЧУ ПОПУТНОМУ ВЕТРУ


Людміла Кебіч
РЕКА БЕЗБРЕЖНАЯ
НАВСТРЕЧУ ПОПУТНОМУ ВЕТРУ


GARODNIA
1128
НАВСТРЕЧУ ПОПУТНОМУ ВЕТРУ
Людмила Шевченко
ВЕСЁЛАЯ КАРУСЕЛЬ
Екатерина Коломийцева-Игнатюк
Нет Никого Кроме Него
поэзия
Почему звенит ручей

 

**Бібліяфэст «Горад мары». Сустрэчы пісьменнікаў з чытачамі, аўтограф-сесіі**

Якое ж свята без падарункаў! Спецыяльна да 895-годдзя Гродна падрыхтаваны зборнік літаратурна-мастацкіх твораў «Лепшы горад Зямлі» і апублікаваны ў выглядзе інтэрнэт-выдання. Пасля выхаду папяровай кнігі абавязкова адбудзецца яе прэзентацыя з удзелам аўтараў, якая, мы ўпэўненыя, стане яркай падзеяй нашага культурнага жыцця, а сама кніга зацікавіць гродзенцаў і будзе карыснай чытачу. Рабочая версія кнігі дапаўняецца новымі эстэтычнымі дэталямі. Абласной пісьменніцкай арганізацыі важна, каб аўтары, сярод якіх шмат новых імёнаў, на ўласным вопыце адчулі і ўсвядомілі ўсе перыпетыі складанага працэсу нараджэння новай кнігі.

Яшчэ мы сардэчна віншуем і сталіцу нашай Радзімы, горад-герой Мінск, які таксама 9 верасня адзначыў дзень свайго нараджэння. Мінск, безумоўна, таксама можна назваць горадам мары, горадам-казкай, горадам-сусветам. Гродзенскія літаратары шчыра жадаюць нашай роднай беларускай зямлі плёну і працвітання, а людзям, якія на ёй жывуць, – толькі шчасця і мірнага неба.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На фота:** моманты і ўдзельнікі бібліяфэста «Горад мары» да 895-годдзя горада Гродна. Парк Жылібера, 9 верасня 2023 года.


Гродно –
город мечты
GARODNIA
1128